# РОЛЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў ФАРМІРАВАННІ ДУХОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ НАРОДА

***А.А. РЫБЧЫНСКАЯ***
*Пінск, ПалесДУ*

Развіццё новых грамадскіх адносін у цяперашні час непазбежна выдзвігае праблему маральнага фарміравання асобы, патрабуе асэнсаваць, якім усё ж такі павінен быць маральна–выхаваны чалавек. Сярод самых галоўных пытанняў выступаюць такія, як фарміраванне ў чалавеку пачуцця адказнасці перад грамадствам, актыўнага разумення ім сваіх сацыяльных функцый, адносіны да акаляючага асяроддзя, людзей, асэнсаванне сваіх правоў і абавязкаў, этычных норм, шляхоў пазнання і пераўтварэння света ў лепшую старану. У штодзённым жыцці, называючы што–небудзь прыгожым або агідным, мы выказваем свае адносіны да той ці іншай з'явы, абумоўленыя многімі фактарамі, у тым ліку і нормамі маралі.

Ва ўмовах крызісу, якім ахоплены розныя сферы грамадства, чалавек цалкам дэзарыентаваны. Адны каштоўнасці, з ліку ўхвальных, згубілі свой колішні статус, другія – якія раней дэкларавалiся як адмоўныя – паўстаюць пазітыўна і яскрава афарбаванымі. Крызіс грамадства, закрануўшы сферу індывідуальнай і грамадскай свядомасці, абвострыў праблему каштоўнасцей. "Чым у большай небяспецы знаходзіцца жыццѐ, тым ярчэй ззяюць яго глыбінныя каштоўнасці" (Поль Ля Кур). Пастаноўка праблематыкі агульначалавечых каштоўнасцей узнікае як адказ на вызаў часу. Хутчэй за ўсё наш час будзе пазначаны ў гісторыі як перыяд вялікай пераацэнкі каштоўнасцей, напружаных роздумаў па мностве пытанняў, пастаўленых жыццѐм. Як ніколі раней, і навуковая думка, і намаганні практыкаў засяроджваюцца на тым, каб знайсці шляхі выхаду з крызіснай сітуацыі, прапанаваць свае ідэі абнаўлення, перабудовы адукацыі: у цэлым увогуле і па многіх канкрэтных накірунках гэтай вельмі складанай справы у прыватнасці.

Палітычныя і сацыяльна–эканамічныя змены, якія адбываюцца ў грамадстве, аказалі сур'ѐзны ўплыў на ўсе сферы жыцця і дзейнасці людзей. Сфарміраваліся новыя ўстаноўкі і каштоўнасці, з'явіліся новыя крытэрыі ацэнкі тых ці іншых з'яў, фактаў, працэсаў. Гэта прывяло да змянення каштоўнасных арыенціраў моладзі.

Духоўны чалавек – гэта грамадзянін і патрыёт з моцным нацыянальным характарам, адказны за даручаную працу, здольны працаваць і адапціравацца да зменлівых сацыяльных умоў. Ён добры і чулы, паважліва адносіцца да дзяцінства, старасці, да каштоўнасцей здаровай сям'і, вядзе здаровы лад жыцця, маральна ўстойлівы, эстэтычна адукаваны. Гэта чалавек са здаровым пачуццём нацыянальнага гонару і развітай нацыянальнай самасвядомасцю.

Здаўна беларуская літаратура замацоўвала ідэалы прыгажосці, справядлівасці і дабра, адыгрывала значную ролю ў фарміраванні духоўных, маральных і эстэтычных каштоўнасцей народа.

Мастацкая літаратура – адзін з самых папулярных і даступных відаў мастацтва. У адрозненне ад навукі яна раскрывае з'яву цэласна, аб'ёмна, маштабна, у рэальным перапляценні і ўзаемадзеянні яе разнастайных якасцей і адметных асаблівасцей, паказвае з'яву з эстэтычных пазіцый.

Літаратура – гэта ў першую чаргу чалавеказнаўства. У гэтым яе асаблівая каштоўнасць. Іншы раз на дзвюх–трох старонках літаратурнага твора апісваецца ўсё жыццё чалавека, а часам ва ўсёй кнізе – адно імгненне, эпізод. Літаратары пішуць пра матэрыяльнае і духоўнае, пра лёс чалавека і лёс краіны, пра дабро і зло, пра з'явы прыроды. Ад таленту пісьменніка, ад яго здольнасці за малым бачыць вялікае, вылучаць галоўнае, ад яго ўменне адкрываць чалавечае ў чалавеку залежыць глыбіня пранікнення ў свет чалавечай душы, у сутнасць падзей і адпаведна каштоўнасць твора для зацікаўленага чытача. Усё, што напісана пісьменнікам – гэта не толькі плён яго фантазіі, але і пераасэнсаваны аўтарам жыццёвы вопыт, напоўнены вялікай колькасцю моцных пачуццяў, гэта праяўленні сімпатый і антыпатый да розных з'яў і падзей. З мноства фактаў пісьменнік выбірае найбольш характэрныя,



ПолесГУ

тыповыя, значныя. У таленавітага творцы мова і стыль мастацкага слова набываюць асаблівае значэнне.

У мастацкай літаратуры слова – галоўны будаўнічы матэрыял. Яно перадае найтанчэйшыя парывы душы, разнастайныя адценні ўсіх фарбаў. Пры мастацкім апісанні слова становіцца гнуткім, зменлівым, рухомым і ў той жа час з'яўляецца дакладным, канкрэтным інструментам.

Паводле выказвання філосафа Гегеля, слова з'яўляецца самым пластычным матэрыялам з усіх, што належаць чалавечаму духу. Здаўна літаратуру называюць прыгожым пісьменствам. Праз мастацкія творы можна лёгка перадаць не толькі знешні вобраз, пластыку танцавальных рухаў ці велічнасць архітэктурнага збудавання, але і ўнутраны свет і стан душы чалавека.

Выдатны рускі літаратурны крытык В.Р. Бялінскі пісаў: "Філосаф гаворыць сілагізмамі, паэт – вобразамі і малюнкамі, але гавораць яны аб адным і тым жа… адзін даказвае, другі паказвае, і абодва пераконваюць, толькі адзін лагічнымі довадамі, другі – малюнкамі. Але першага слухаюць і разумеюць нямногія, другога – усе… Тут ні навука не можа замяніць мастацтва , ні мастацтва навуку.

Літаратура мае яшчэ адну важнейшую якасць. Яна выяўляе і фарміруе нацыянальнае жыццё, стымулюе нацыянальную псіхалогію, уздымае самасвядомасць народа, акумулюе культуру, з'яўляецца адной з першакрыніц утварэння і развіцця літаратурнай мовы. Ва ўсе часы іншай трыбуны, апроч літаратуры, у народа не было і не магло быць. З дапамогай літаратурных крыніц мы спасцігаем дух часу, сувымяраем свой жыццёвы вопыт, пазнаём заканамернасці сацыяльных рухаў, усведамляем праблемы развіцця грамадства. Дзякуючы творам мастацкай літаратуры, мы глыбей спасцігаем гісторыю свайго краю, жыццё народа, лепш разумеем час і сябе.

Так сталася, што на працягу ўсяго перыяду свядомага развіцця чалавецтва цэнтрам духоўнага ўдасканалення грамадства з'яўлялася літаратура. Рух грамадства, несумненна, адбываецца па сваім законах, і этапы гэтага руху, яго закан-



ПолесГУ

амернасці мы пазнаём перш за ўсё праз, праз друкаванае слова.

На жаль, сённяшняе пакаленнне моладзі усе менш і менш звяртаецца да кнігі, як крыніцы пазнання жыцця і яго маральна–этычных нормаў. Чытанне выцясняецца рознымі відамі сродкаў сучаснай масавай інфармацыі (інтэрнэт, тэлебачанне і інш.). Літаратура – адзін з відаў мастацтва, які ўздзейнічае на чытача эстэтычна, раскрывае перад ім свет прыгожага. Носьбітам гэтай прыгажосці з’яўляецца перш за ўсё герой твора, надзелены пэўнымі маральнымі якасцямі. Працэс пазнання літаратуры як мастацтва арганічна звязаны з працэсам фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый чытача, адносін яго да жыцця, да людзей, працэсам усведамлення сябе асобай. Знаёмства з беларускай літаратурай дапамагае убачыць разнастайнасць свету, адкрыць таямніцы пісьменніцкага майстэрства, набыць вопыт маўленчай і творчай дзейнасці, авалодаць культурай чытання, з павагай і любоўю ставіцца да мастацкай кнігі. Такім чынам, у арганічнай сувязі з пазнаннем літаратуры як мастацтва ідзе і працэс фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый чалавека, адносін яго да жыцця, да людзей, працэс усведамлення сябе асобай.

Самая важная задача і магчымасць нацыянальнай літаратуры  спрыянне духоўнаму выхаванню асобы і наогул усяго народа. Варта  дзначыць, што праз чытанне і ўспрыманне мастацкіх твораў сапраўды адбываецца маральнае выхаванне асобы, яе духоўны рост.

Чытаючы творы В. Быкава, ведаючы яго лёс і яго погляд на вайну, нельга заставацца раўнадушным! Пісьменніку цудам  ўдалося выжыць у суровых абставінах ліхалецця, бацькі нават атрымалі звестку аб яго смерці і некаторы час аплаквалі сына. В. Быкаў даносіць да нас тое, што давялося перажыць самому. Эпіграфамі да сваіх твораў ён абраў такія радкі: "Чым мацней я люблю жыццё – тым больш ненавіджу вайну”, "Народ жыве, пакуль жыве яго памяць”, "Народ, які не ведае сваёй гісторыі, не мае права на будучыню”. [1] Чытаючы творы аб вайне, мы суперажываем героям, пражываем з імі адно жыццё, робім уласны выбар, параўноўваем,

аналізуем, шукаем ісціну, разважаем, усхваляем і асуджаем, а даволі часта захапляемся.

Тэму вайны ў беларускай літаратуры адлюстроўваюць сапраўдныя майстры слова – І. Навуменка, Б. Сачанка, І. Чыгрынаў, Р. Барадулін, П. Глебка, В. Адамчык і інш. Праз пазнанне іх твораў можна назіраць духоўнае яднанне пакаленняў, узор гераізму і патрыятызму.

Вялікі спектр пачуццяў і эмоцый мы атрымоўваем знаёмячыся з творамі У. Караткевіча, І. Мележа, М. Багдановіча, М. Танка, Н. Гілевіча і інш. Даказана, што ўменне суперажываць – гэта магутная сіла чалавека, якая фарміруе ў ім лепшыя якасці.

Тэма маці таксама займае важнае месца ў беларускай літаратуры. Амаль кожны з беларускіх паэтаў і пісьменнікаў закранае гэтую жыццёвую, вельмі балючую і хвалюючую тэму. А адносіны чалавека да сваіх бацькоў з'яўляюцца асноўнай меркай яго вартасці, яго унутранага самавыражэння.

Аб пачуццях аўтара да маці гавораць радкі П. Панчанкі:

Голас незнаёмага можа здзівіць,
Голас сябра – на хвіліну спыніць,
Голас каханай – сагрэць сонцам лета,
Голас маці – падняць з таго свету. [6, с. 99]

Паэт П. Броўка прысвяціў маці, якая загінула ў Асвенцыме, цэлую паэму пад назвай "Голас сэрца". З. Бядуля стварыў выдатнае апавяданне "На каляды к сыну", якое заўсёды моцна ўстрывожвае чытачоў сваім жыццёвым сюжэтам. Стаўшы багачом, сын адрокся ад сваёй маці – неадукаванай, простай, хворай жанчыны. Ён спрабуе адкупіцца ад яе любові грашыма. Ад роспачы жанчына выпускае з рук гэтыя пякучыя паперкі, якія шалёна разносіць па дарозе вецер. Але маці ўсё даруе свайму адзінаму сыну.

Дзейснае слова і талент пісьменнікаў праз суперажыванне і часам слёзы здольны ачышчаць нашы душы.

Увогуле духоўны патэнцыял беларускай літаратуры – неаб'ёмны. Гэта і гістарычная тэма, тэма сярэднявечча, дзейнасць асветнікаў Е. Полацкай і Ф. Скарыны, тэма Радзімы, кахання, існавання і прызначэння чалавека на Зямлі, тэма прыроды.

Полесгу

Выхаванню і духоўнаму ўдасканаленню асобы спрыяе абмеркаванне вечных праблем – адносін бацькоў і дзяцей, адносін да іншых, да самога сябе. Гэта магчымасць зазірнуць у свой унутраны свет, пазнаць жыццё, вучыцца жыць, будаваць адносіны, будаваць сябе. У нацыянальнай літаратуры адлюстроўваецца ўсё жыццё, людзі з іх побытам і традыцыямі, з павер'ямі і  звычкамі, з культурай і мовай, што з'яўляецца самай дарагой нацыянальнай спадчынай.

Вельмі значнай з'яўляецца творчасць паэтаў–філосафаў – М. Танка, С.  Грахоўскага, Н. Гілевіча – глыбокі сэнс твораў якіх можна браць за жыццёвую аснову. Кожны верш гэтых паэтаў гучыць як споведзь, як малітва:

Паспавядаўся – і стала лягчэй,
Не перад Богам,
А прад чалавекам,
Каб зніклі кашмары трывожных начэй
І страх перад нашым
Заблытаным векам.

С. Грахоўскі [2, с. 62]

Мастацкая літаратура і ў прыватнасці, творы беларускіх аўтараў з'яўляюцца адным з самых моцных і дзейсных сродкаў у станаўленні асобы чалавека і выхаванні яго духоўнасці. Менавіта бібліятэкі маюць  ў сваім арсенале багатыя фонды нацыянальнай літаратуры і валодаюць разнастайнымі метадамі і формамі работы з кнігаю. На жаль, у наш век глабальнай камп'ютарызацыі цікавасць да кнігі як бы саступае свае вядучыя пазіцыі ў распаўсюджванні ведаў. Цікавасць маладога пакалення да чытання падае, таму на сучасным этапе задача бібліятэкі – вярнуць цікавасць да друкаванай кнігі і пасрыяць таму, каб тэхнічныя цуды сучаснасці прыйшлі не на змену кнігам, а толькі ў якасці дапаўнення да іх. У сучасных умовах, бібліятэка не можа быць цікавай і запатрабаванай для ўсіх катэгорый чытачоў без змен традыцыйных формаў і метадаў работы, праяўлення творчасці бібліятэкараў.  Сённяшні дзень патрабуе ад бібліятэк нестандартных рашэнняў, актыўнай пазіцыі і хуткай рэакцыі на ўсе змены. Бібліятэкі



ПолесГУ

шмат працуюць над стварэннем свайго прывабнага, сацыяльна значнага вобліку ў грамадскай свядомасці, імкнуцца быць больш адкрытымі і даступнымі для карыстальнікаў.

Значную работу па фарміраванню, раскрыццю і прапагандзе фонда мастацкай беларускай літаратуры праводзіць бібліятэка Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. Улічваючы інтарэсы і патрэбы карыстальнікаў, супрацоўнікі бібліятэкі ўдасканальваюць звыклыя  і традыцыйныя формы работы з кнігай. Акрамя гэтага яны шукаюць новыя, нетрадыцыйныя і эфектыўныя формы работы, якія нясуць не толькі пазнавальную інфармацыю, але і з'яўляюцца відовішчнымі і эмацыйнымі. Актыўна і align рознабакова экспануецца фонд нацыянальнай літаратуры. Звычайна ўсе кніжныя выставы, арганізаваныя супрацоўнікамі ўніверсітэцкай бібліятэкі вельмі яркія, ілюстраваныя і прывабныя для карыстальнікаў. Напрыклад "Слава кніжцы беларускай", "Адкуль наш род і наша мова", Родная мова – матчына мова, ззяе вясёлкай кожнае слова", Беларуская кніга ў вашым доме", "Уладзімір Караткевіч – пісьменнік, паэт, драматург", "Максім Багдановіч – асоба і творчасць", "Ясны позірк Ефрасінні праз стагоддзі" і інш.. А яшчэ яны максімальна інфарматыўныя з ўлікам інфармацыйных рэсурсаў усіх структурных падраздзяленняў бібліятэкі.

Вялікую ролю ў далучэнні карыстальнікаў да чытання і асэнсавання  беларускіх мастацкіх твораў адыгрываюць мерапрыемствы, якія праводзіць бібліятэка. Улічваючы інтарэсы і патрэбы чытачоў , з дапамогай розных наглядных сродкаў і выкарыстоўваючы разнастайныя формы правядзення, супрацоўнікі бібліятэкі стараюцца раскрыць багацце культурна–гістарычнай спадчыны беларускага народа, спрыяць выхаванню пачуцця любові да роднага краю, роднай мовы, роднай літаратуры. Да Сусветнага дня паэзіі была прымеркавана творчая сустрэча з паэткай Марыяй Кобец "Сэрца маё о Піншчына, шчасце маё Берасцейшчына", на якой адбылася прэзентацыя зборніка яе вершаў "Палыновая квецень". Акрамя самой паэткі у мерапрыемстве прынялі ўдзел яе сябры–паэты Анатоль Шушко і Валерый Грышкавец. Літаратурны калейдаскоп "Пісьменнікі роднай зямлі " і

літаратурна–музычная кампазіцыя “Зорка Максіма Багдановіча” сабралі вялікую колькасць зацікаўленых гледачоў, таму што спалучалі ў сабе не толькі дакладнасць і інфарматыўнасць, але былі напоўнены атмасферай шчырасці і цеплыні. Хочацца адзначыць, што прымусіць чытаць і наведваць бібліятэку нельга, а вось зацікавіць – можна і ў першую чаргу гэта залежыць ад асобы бібліятэкара.

На жаль, няма агульнага рэцэпту ў выхаванні духоўнасці, але пакуль ёсць нацыянальная літаратура, чыстае і праўдзівае слова, ёсць шчырыя людзі і цёплыя іх сэрцы – будзе жыццё на Зямлі.

**Спіс крыніц літаратуры**

1. Бугаёў Д. Васіль Быкаў : нарыс жыцця і творчасці / Д. Бугаёў. – Мн: Народная асвета, 1987. – 207с.: іл.

2. Давыдава, Г. Сяргей Грахоўскі і яго кніга “Споведзь”//Роднае слова. – 2002. – №4. – с. 62 – 63

3. Канцэптуальныя падыходы да рэалізацыі філалагічнай адукацыі ў школе і вну : зб. матэрыялаў рэсп. навуковай канф., Брэст, 14 лістапада 2013 г. / рэдкал. : З.П. Мельнікава, І.А. Швед, А.С. Кавалюк, І.А. Воран, Г.М. Ішчанка, С.М. Шчэрба, У.А. Сенькавец ; пад агул. рэд. У.А. Сенькаўца ; Брэсц. дзярж. ун–т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2015. – 281с.

4. Прасalovіч,В.У. Фарміраванне каштоўнасных арыентацый школьнікаў/Т.В. Рубанік, В.У. Дылеўская //Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і літаратуры ў школе і ВНУ: зб. навук. арт. Вып. 5/пад рэд. І.У.Таяноўскай, Т.В. Мальцэвіч. – Мн.: БДУ, 2006. – с. 46 – 50

5. Протчанка,В.У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. – Мн., 2001. – 212с.

6. Танк, М. Збор твораў: у 6–ці т. Т.4. Вершы. 1964–1976 / М. Танк. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1979. – 720с.



Полесгу